Прыёмная кампанія – 2020

# ФАКУЛЬТЭТ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН ПАЛЬМУ ПЕРШЫНСТВА НЕ САСТУПІЎ

## У БДУ і БДУІР па шэрагу спецыяльнасцяў былі пабіты леташнія рэкорды прахадных балаў

**Так, істотны іх рост быў адзначаны на факультэце міжнародных адносін (ФМА) і факультэце філасофіі і сацыяльных навук (ФФСН). На групу з дзвюх спецыяльнасцяў профілю «Міжнародныя адносіны» па аб'яднаным конкурсе залічаны 22 абітурыенты, прахадны бал склаў 382 (у 2019 годзе — 379). На спецыяльнасць «Міжнароднае права» прахадны бал быў 386 (у 2019 годзе — 385), «Міжнародныя адносіны» — 382 (у 2019 годзе — 379).**

На спецыяльнасць «Лінгвакраіназнаўства» залічаны 14 абітурыентаў. Прахадны бал — 382 (у 2019 годзе — 378). Чатыры абітурыенты залічаны без іспытаў.

На спецыяльнасць «Мытная справа» залічаны 17 чалавек, з іх пяць без іспытаў і шэсць па мэтавым прыёме. Прахадны бал — 357.

На групу з дзвюх спецыяльнасцяў эканамічнага профілю факультэта міжнародных адносін па аб'яднаным конкурсе залічаны 20 абітурыентаў, прахадны бал — 362. На асобных спецыяльнасцях склаліся наступныя прахадныя балы: «Сусветная эканоміка» — 372; «Менеджмент» (кірунак — менеджмент у сферы міжнароднага турызму) — 362. Усяго на ФМА залічана 67 «бюджэтнікаў».

Студэнтамі факультэта філасофіі і сацыяльных навук сталі 64 чалавекі. На групу з трох спецыяльнасцяў па аб'яднаным конкурсе залічаны 34 абітурыенты, з іх адзін абітурыент паступіў без экзаменаў. Прахадны бал па аб'яднаным конкурсе — 342 (у 2019 годзе — 328). Па асобных спецыяльнасцях прахадныя балы склалі: «Сацыяльныя камунікацыі» — 363 (у 2019 годзе — 344), «Сацыялогія» — 344 (у 2019 годзе — 330), «Філасофія» — 342 (у 2019 годзе — 328), «Псіхалогія» — 344 (у 2019 годзе — 337), «Сацыяльная работа» — 296 (у 2019 годзе — 289).

На факультэце радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій па спецыяльнасцях аб'яднанага конкурсу дзённай формы навучання залічаны 205 абітурыентаў, з іх адзін прыняты без экзаменаў. Прахадны бал склаў 291. На асобных спецыяльнасцях прахадныя балы наступныя: "Камп'ютарная бяспека" (кірунак — радыёфізічныя метады і праграмна-тэхнічныя сродкі) — 314, «Прыкладная інфарматыка» (кірунак — інфармацыйныя тэхналогіі тэлекамунікацыйных сістэм) — 317, «Радыёфізіка» — 296; «Аэракасмічныя радыёэлектронныя і інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі» — 307, «Фізічная электроніка» — 291.

На факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі па аб'яднаным



конкурсе залічаны 276 абітурыентаў, прахадны бал склаў 328. Сярод залічаных 24 прыняты без экзаменаў. Прахадныя балы па спецыяльнасцях і кірунках: «Прыкладная інфарматыка» (кірунак — праграмнае забеспячэнне камп'ютарных сістэм) — 353, «Інфарматыка» — 352, «Актуарная матэматыка» — 328, «Камп'ютарная бяспека» (кірунак — матэматычныя метады і праграмныя сістэмы) — 342, «Прыкладная матэматыка» — 331, «Эканамічная кібернетыка» — 328.

У БДУІР самы высокі прахадны бал на бюджэтнай форме навучання — 366.

Ці змянілася тройка лідараў? Самай папулярнай стала спецыяльнасць «Электронны маркетынг» на інжынерна-эканамічным факультэце, а летась былі «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у гульнявой індустрыі)» на факультэце інфармацыйных тэхналогій і кіравання (364 бала). Сёлета гэтая спецыяльнасць заняла другі радок: каб паступіць туды, трэба было мець сама меней 365 балаў. Летась прахадны бал на «Электронны маркетынг» быў 363, а на спецыяльнасць «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у гульнявой індустрыі)» — 364.

Тройку лідараў замыкае «Эканоміка электроннага бізнесу» на інжынерна-эканамічным факультэце з 363 баламі (у 2019 годзе — 358). Летась на трэцяй пазіцыі была спецыяльнасць «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» (факультэт камп'ютарных сістэм і сетак): 360 балаў у 2019 годзе і 358 — у гэтым. Цяпер гэта ўжо чацвёртая пазіцыя.

Максімальны бал, з якім былі пададзены дакументы, — 396. Іх уладальніца — выпускніца Лунінецкай гімназіі Валерыя Рамановіч — падала свае дакументы на «Эканоміку электроннага бізнесу». Летась максімум склаў 390 балаў.

Мінімальны прахадны бал і ў папярэднім, і ў гэтым годзе склаўся на спецыяльнасці «Электронныя і інфармацыйна-кіруючыя сістэмы фізічных установак». Каб сюды паступіць, дастаткова было набраць 257 балаў (у 2019 годзе — 296).

Усяго на дзённую бюджэтную форму атрымання адукацыі залічаны 1060 абітурыентаў. Завочна атрымліваць адукацыю будуць 30 студэнтаў. Без экзаменаў быў залічаны 21 чалавек, сярод іх пятнаццаць з'яўляюцца пераможцамі рэспубліканскіх алімпіяд, а шэсць замежных грамадзян залічаны без уступных выпрабаванняў у рамках міжнародных пагадненняў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота з сайта bsuir.by**




# СТАРОНКІ НАШАЙ ГІСТОРЫІ

**Канферэнц-залы мінскага Дома кнігі «Светач» ледзь хапіла для ўсіх, хто хацеў прысутнічаць на прэзентацыі цікавага праекта, арганізаванага Прэзідэнцкай бібліятэкай, Міністэрствам інфармацыі, Міністэрствам адукацыі, газетай «СБ. Беларусь Сегодня» і аналітычным агенцтвам Ecoom. Прысутныя размясціліся таксама і ў блізкай зале са стэндамі, дзе былі выстаўлены кнігі, пра якія расказвалі выступоўцы.**

Такая выстаўка кніг ладзілася тут з нагоды знаёмства з праектам «Гордасць ЗА Беларусь», мэтай якога было на прыкладах з розных сфер жыцця яскрава паказаць перамены ў жыцці Беларусі за гады яе незалежнасці. Сумесны праект пераканаўча адлюстраваў дасягненні ва ўсіх галінах, пазнаёміў з этапамі развіцця дзяржавы. Большасць выданняў і ўзораў плакатнай прадукцыі дэманстравалі высокі ўзровень айчыннай друкарскай базы.

Асобую цікавасць выклікалі выданні, падораныя ў свой час Прэзідэнту Рэспублікі Беларусі вядомымі пісьменнікамі, публіцыстамі. З выданнямі, якія апавядаюць пра абаронцаў Айчыны, пазнаёмілі самі вайскоўцы. Вучоныя і спецыялісты расказалі пра кніжныя навінкі адпаведных галін.

**Яўген ПЯСЕЦКІ,**
**фота аўтара.**







